**С. М. Кулага**,
настаўнік беларускай мовы і літаратуры першай катэгорыі
гімназіі «Логас» г. Вілейкі

# Спрыяльная атмасфера на ўроку – залог поспеху працы

## Урок беларускай мовы ў 5 класе

Кожны ўрок – гэта творчасць, пошук, адкрыццё, роздум, знаходка...

Беларуская мова з'яўляецца не толькі прадметам вывучэння, але і сродкам пазнання, развіцця і выхавання.

Тэма прапанаванага ўрока «Складаны сказ». На ўроку фарміруецца ўменне адрозніваць просты сказ ад складанага. Вывучэнне дадзенай тэмы садзейнічае практычнаму авалоданню асновамі маўленчай дзейнасці, выхаванню павагі і любові да роднага краю, мовы свайго народа.

Урок камбінаванай будовы. У аснову тлумачэння новай тэмы пакладзены матэрыял падручніка. Абраны паскораны тэмп навучання, таму што матэрыял вывучаны на ўроках рускай мовы і ў пачатковай школе.

Пяты клас з'ўляецца пераходным ад пачатковай да сярэдняй ступені навучання. У ім не проста працягваецца вывучэнне новых тэм, але адбываецца паўтарэнне і абагульненне тых ведаў, якія былі атрыманы ў пачатковай школе. І ад таго, наколькі ўмела настаўнік створыць на ўроку ўмовы для праяўлення і задавальнення пазнавальных і камунікатыўных патрэб вучняў, залежыць поспех сумеснай працы вучняў і настаўніка. У пятым класе асаблівую ўвагу неабходна звярнуць на такія формы працы, якія ствараюць спрыяльную атмасферу на ўроку, арганізаваць маўленчыя зносіны вучняў для развіцця іх уяўлення і творчых здольнасцей, эфектыўнага ўключэння ў пазнаваўчую дзейнасць.

Такія ўрокі заўсёды садзейнічаюць удасканаленню навыкаў маўленчай культуры.

**Тэма:** Складаны сказ.

**Мэта**: фарміраванне ўмення адрозніваць просты сказ ад складанага.

**Задачы**:

- засваенне ведаў пра сказ як сінтаксічную адзінку, знаёмства з асаблівасцямі яго будовы;
- удасканаленне ўмення знаходзіць складаныя сказы ў тэксце, правільна інтанаваць іх, адрозніваць ад простых развітых сказаў з аднароднымі выказнікамі, вызначаць часткі складаных сказаў, сродкі іх сувязі і граматычныя асновы;
- выхаванне павагі і любові да роднага краю, мовы свайго народа.

**Абсталяванне**: малюнкі вучняў, падручнікі, сшыткі, лісты кляновыя, карткі, схемы, тлумачальны слоўнік.


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/kulaga.pdf

## Ход урока

**1. Арганізацыйны момант**

– Сёння на ўроку мовы мы будзем вучыцца не толькі будаваць словазлучэнні і сказы, расстаўляць знакі прыпынку ў сказах , але і сябраваць, падтрымліваць адзін аднаго, радавацца поспехам іншых і быць гатовымі прыйсці на дапамогу ў цяжкую хвіліну.

**2. Падрыхтоўка да ўспрымання новага матэрыялу**

Настаўнік чытае эпіграф да ўрока:

*Лістападу радуйся і снежню,*
*І вятрам асеннім, і снягам.*
*І малая крыўда стане смешнай,*
*І як добра жыць – адчуеш сам* (П. Панчанка).

Давайце забудзем усе нягоды, усміхнёмся сябрам па парце, настаўніку. Дазволім гаспадарыць на ўроку чуласці і дабрыні. Працягніце далонькі адзін аднаму, адчуйце іх цеплыню. Бо што нам снег або дождж, калі мы разам. За акном – сцюдзёная зіма. А ў пакоі гаспадарыць прыгажуня-восень. (*Вучні класа падрыхтавалі ілюстрацыі да выстаўкі «Фарбы восені».*)

Многія мастакі, кампазітары, пісьменнікі звярталіся да гэтай пары года. Успомніце, калі ласка, аўтара наступных радкоў. (*Вучань чытае ўрывак з паэмы «Новая зямля» Якуба Коласа «На ніцях белай павуцінкі…».*)

Аўтар урыўка з паэмы «Новая зямля» Якуб Колас, народны пісьменнік Беларусі, глыбока разумеў прыроду роднага краю, быў выключна назіральным і ўсё тое, што для іншых было непрыкметным, з любоўю перадаваў у сваіх творах.

Тэма сённяшняга ўрока звязана не толькі з мовай, але і з літаратурай, музыкай, мастацтвам.

**Пытанні і заданні па тэме ўрока.**

(*На дошцы малюнкі са словамі: …осень, бяро…ка, паву..інка, лістапа…*)

– Вось бяда…Літары зніклі …Як жа я вярну малюнкі вучням?…Можа, вы мне дапаможаце выправіць памылкі? Якія правілы мы ўспомнім, каб правільна ўставіць літары?

(*Вучні называюць літару, якую патрэбна ўставіць, тлумачаць правапіс.*)

– Давайце з дапамогай залежнага слова – прыметніка – удакладнім назвы малюнкаў.

(***Залатая*** восень, ***маладая*** бярозка, ***белая*** павуцінка, ***цёплы*** лістапад.)

Звяртаю ўвагу на словазлучэнне ***цёплы лістапад***. Дзеці, а што гэта за сюрпрыз? (*Да малюнка прымацаваны бярозавы лісцік з заданнем: запісаць схему сінтаксічнага разбору словазлучэнняў.*) Успомніце, калі ласка, якой яшчэ часцінай мовы можа выражацца галоўнае слова ў словазлучэнні? (Вусна прыводзім прыклады, напрыклад, радуйся лістападу – з эпіграфа.)

Запішам у сшыткі і на дошцы словазлучэнні, пабудуем схему словазлучэння ***радуйся лістападу***.

Я назбірала для вас, як напамін аб восені, кляновыя лісты. (*На дошцы –*


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/kulaga.pdf

*кляновыя лісты са словамі: завязала восень, маладой бярозцы, з белай павуцінкай, жоўтую хусцінку.*)

Ці можна з дапамогай дадзеных слоў утварыць сказ? Як аб'яднаны словы ў сказе? Растлумачце сэнс слова ***хусцінка.*** (*Галаўны ўбор жанчыны.*)

Запісваем сказ:

***Маладой бярозцы завязала восень жоўтую хусцінку з белай павуцінкай.*** **(Я. П.)**

– Які гэты сказ па мэце выказвання, па інтанацыі, па будове, па наяўнасці даданых членаў сказа? (Выконваем сінтаксічны разбор простага развітага сказа.)

На пачатку ўрока восень была халоднай, дажджлівай, а цяпер бачыце, якая прыгожая. Гэта дзякуючы нашай стараннасці, цеплыні і пяшчоце.

**Фізкультхвілінка.**

Гучыць музыка. Давайце паспрабуем уявіць бярозку восенню…Заплюшчыце вочкі… Падыміце рукі ўверх, пацягніцеся, як галіны дрэўца да сонца, пакратайце далонькамі, як гэта робяць лісточкі на дрэве. Лісточкі сыплюцца, але бярозка не плача, бо ўсяму свой час…

**3. Знаёмства з новай тэмай**

На дошцы запісаны тэма і мэты ўрока для вучняў.

***Тэма ўрока для вучняў:*** Складаны сказ.

***Мэта ўрока для вучняў:*** пазнаёмімся з будовай складанага сказа, будзем выпрацоўваць уменні утвараць скаладаныя сказы на аснове двух простых, адрозніваць складаныя сказы ад простых развітых.

Самастойнае знаёмства з матэрыялам падручніка на с.157.

– Давайце параўнаем сказы з пр. 215. Чым адрозніваюцца сказы пад лічбай 1 і 2? (*Асновай.*) Колькі граматычных асноў у простым сказе? А ў складаным? Дакажыце, што простыя сказы ў складаным звязаны паміж сабой.

Самастойна сфармулюйце правіла. Назавіце злучнікі, з дапамогай якіх простыя сказы аб'ядноўваюцца ў складаны.

Уважліва разгледзьце схемы на с.158. Злучнікі ***а***, ***але***, ***і*** могуць звязваць не толькі аднародныя члены сказа (напрыклад – *Лістападу радуйся і снежню // І вятрам асенніх, і снягам*), але і простыя сказы – у складаны.

Прачытайце правіла. Адзначце новае (–) і вядомае (+). Назавіце складаныя сказы, растлумачце іх будову і знакі прыпынку. Прывядзіце свае прыклады сказаў.

**4. Замацаванне**

1) Практыкаванне 220 (выпісаць тры складаныя сказы са злучнікамі ***і***, ***але***, ***што***).

Загаловак: Вораг мурашак. А тэма тэксту – жывая прырода. (Чалавек павінен клапаціцца пра будучыню прыроды, каб хапіла месца і рэчцы, і травінцы, і таму ж мурашу. Усе мы зямляне, і павінны жыць у дружбе і ўзаемнай павазе.)

2) Вучні атрымліваюць карткі з заданнем. (Узаемаправерка.)


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/kulaga.pdf

Які сказ адпавядае схеме? Сказ запісаць у сшытку, падкрэсліць граматычную аснову і злучнік.

*1. Мы нарадзіліся і жывём у прыгожым краі.*
*2. Наша Беларусь прыгажэе з кожным годам, і мы ганарымся ёю.*
*3. Люблю свой край, старонку гэту, дзе я радзілася, расла.*

**5. Рэфлексія**

– Падыміце жоўтыя лісточкі тыя, хто выпісаў сказ пад нумарам 2.
– Чым адрозніваецца складаны сказ ад простага?
– У якім сказе аднародныя члены аб'яднаны з дапамогай злучнікаў ***а***, ***і***, ***але***?
– Дайце ацэнку нашай працы на ўроку, ужываючы складаны сказ.

**6. Заключэнне**

Лёгка ісці па жыцці з сябрамі, любая справа пад сілу. Дзякую ўсім за плённую працу.

Каменціраванне адзнак.

**Дамашняе заданне**: практыкаванне 218 (утварыць і запісаць складаныя сказы) або скласці верш (замалёўку) пра Радзіму, ужываючы складаныя сказы.


© «Народная асвета», 2009, №2 http://www.n-asveta.com/dadatki/kulaga.pdf